Bialystok, den 26. September 1943.
Nr. 36.

NEUER WEG
Weissruthenische Wochenzeitung für den Bezirk Bialystok

PREIS 20 Pf.
ЦАНА 20 фнг.

НОВАЯ ДАРОГА

Беларуская тыднёвая газэта на Беластоцкую Акругу

Verlag: Sturmverlag G.m.b.H. Zweigniederlassung Bialystok, Langgasse 16.
Tel. 1020 Bankkonto Stadtsparkasse 700. Anzeigenpreise: z. Zt. ist die Preisliste 1 gültig.

Адрас рэдакцыі: Sturmverlag G.m.b.H. Zweigniederlassung Bialystok, Langgasse 16.
Tel. 1020 Банкконто Гарадзкая Каса Ашчаднасьці 700. Цана абвестак паводле п. л. 1.

№ 36. | Беласток, 26 верасьня 1943 | Год выданьня II.

КАВАЦЬ СІЛЫ

Нарастаньне нашае беларускае інтэлігэнцыі адбывалася ў нас наагул у ненармальных умовах. Гэта былі ўмовы сацыяльнае й палітычна-грамадзкае няволі, якія ўжо самі па сабе, як такія, выключалі магчымасьці шырокага й усебаковага ўзгадаваньня кадраў нацыянальна здаровай і загартаванай інтэлігэнцыі. Чужая школа, чужая культура, якую наладжвалі то расейцы, то палякі на нашых землях, уся сыстэма іх палітыкі былі накіраваны на засымілязаньне беларускага народу. І нічога дзіўнага, што беларускаму інтэлігэнту, пазнаўшаму «праўду» аб сваім народзе, пазнаўшаму да глыбіні сутнасьць Беларускага Адраджэньня, прыходзілася праходзіць цяжкі цярністы шлях, каб астацца чэсным з сабой, з сваім сумленьнем і захаваць свой сьветапагляд. Шлях беларускага інтэлігэнта быў шляхам барацьбы. Адны духова ламаліся на гэтым шляху, адпадаючы ад нашага руху, другія-ж загартоўваліся або гінулі ў непасільным змаганьні. Яны нясьлі праўду Беларускага Адраджэньня ў шырокія народныя масы, не зважаючы на ніякія перашкоды. Іх ідэі пашыраліся ў народзе, бо яны вырасталі з яго жыцьця й яго імкненьняў. Ідэя Беларускага Адраджэньня, на аўтар якой зложылі ў ахвяру свае косьці лепшыя сыны нашага народу, знаходзіла ўсё больш водгаласаў у народных гушчах.

Гэта ня сталася адразу. Усё больш і больш расьлі рады адраджэнцаў і павялічваўся наш беларускі актыў. Праз арганізацыі, курсы, школы, прэсу, турмы, нацыянальную й сацыяльную паняверку крысталізаваліся сьвядомыя беларускія сілы. Ад аднаго да другога перадавалася Ідэя Беларускага Адраджэньня. Маючы пад сабой глыбокія гістарычна-бытавыя падставы, яна хутка ахапіла ўвесь наш народ. Няма ўжо нідзе закутка ў Беларусі, дзе-б знайшоўся несьвядомы беларус. Нацыянальная сьведамасьць пранікла ўжо ў кожнае беларускае сэрца. Усё гэта было асягнута дзякуючы самаахвярнай працы лепшых сыноў нашага народу. Калі мы параўнаем сучасны стан нашага руху з тым, які мы мелі яшчэ некалькі дзесяткаў гадоў таму назад, то мы павінны сьцьвердзіць вялікі поступ.

Наш рух разьвіваецца й ідзе ўсьцяж наперад да свайго кансэквэнтнага гістарычнага вырашэньня. Калі раней інтэлігэнт мусіў траціць усе свае здольнасьці й энэргію на тое, каб выясьніць народу яго нацыянальную адасобленасьць, то цяпер перад ім адчыняюцца шырокія магчымасьці ўдзячнае працы сярод зусім сфармаванага й акрэсьленага нацыянальна асяродзьдзя. Спытайцеся сягоньня кожнага беларуса — хто ён — і вы пачуеце выразны адказ: «я — беларус».

Дый паняцьці народу й інтэлігэнцыі ў сучасны мамэнт значна зьмяніліся, розьніца паміж імі ўсё больш заціраецца. Інтэлігэнт не зьяўляецца ўжо, як раней, апосталам ідэі Адраджэньня, ён сягоньня працуе ўва ўсіх кутках нашае Бацькаўшчыны, зьліваючыся з народам, які яго разумее й актыўна супрацоўнічае з ім.

Размах беларускага нацыянальнага будаўніцтва і шырокія магчымасьці сапраўды нацыянальнае працы, якія мы атрымалі ў выніку вайны Нямеччыны з Польшчай, а пасьля з Саветамі, прысьпешылі прырост беларускага актыву. Ня толькі практыкаваныя вымаганьні сягоньнешняга дня, калі патрабуецца й беларускі бугальтар, і урадовец, і паліцыянт і г. д., але наагул уся сучасная атмасфэра, у якой разьвіваецца нашае нацыянальнае жыцьцё, змушаюць нас, ня гледзячы на ўсё, каваць новыя сілы. З аднаго боку даканчываюць асьвету [illegible]дзесяткі тысяч тых беларусоў, якія пад п[illegible]аньнем чужынцаў дзякуючы розным прычын[illegible] маглі яе закончыць раней. З другога [illegible] шмат беларусаў, саткнуўшыся з рэальным[illegible]ньнямі, змушаны самі давучвацца, высту[illegible]самастойна й выконваць адказную працу. [illegible]ут мы маем падобнае зьявішча, якое можна [illegible]о назіраць раней, калі праз беларускія ар[illegible]цыі выкоўвалася народная інтэлігэнцыя. [illegible]рус, які мае часта невялікую асьвету, мо[illegible]гоньня хутка перайсьці ў рады інтэлігэн[illegible]эшце, да нашага руху прystала вельмі [illegible] беларусаў, якія яшчэ ўчора стаялі во[illegible] ад нашае справы, або нават знаходзіліс[illegible] чужацкімі ўплывамі. Ясна, што тут не[illegible]усім ім паставіць пытаньне: «А што вы рабілі дзесяць гадоў таму назад?» Бо ж рух наш пад чужацкай няволяй праходзіў у варунках цяжкога змаганьня, і нельга было кожнаму перадаць увесь камплекс перажываньняў, увесь сьветапагляд пакаленьня беларускіх адраджэнцаў. На гэта ня было ані часу, ані магчыма[illegible]і. Часта толькі апошнія падзеі, калі горкі досьлед ці то ў палоне, ці на працы ў Нямеччыне, ці пачутая праўда аб беларускім руху, якую сягоньня мы можам свабодна гаварыць, змусілі гэткага засыміляванага, або пасыўнага раней беларуса паважна задумацца над сваім палажэньнем і знайсьці самога сябе. Гэты працэс, у меру нашага нацыянальнага росту, будзе, бязумоўна, адбывацца й далей, і нашы рады будуць павялічвацца коштам нашых зрусыфікаваных і апалячаных раней беларусаў. Ясна, сярод іх знойдзецца шмат каньюнктурыстаў і «прахадзімцаў», якія гатовы, як кажуць, пагрэць рукі на нашай справе, і на гэта нам нельга зачыняць вачэй. Асаблівыя ўмовы нашае нацыянальнае працы й змаганьня ня выключаюць нават магчымасьці сьвядомае правакацыі.

Аднак, пры наяўнасьці правідловага напрамку нашага руху, пры яго масавасьці й дынаміцы, нам вышэйазначаныя выпадкі нястрашны. У працэсе грамадзкае працы пустое насеньне лёгка адсейваецца само або нішчыцца здаровым элемэнтам.

Так ці інакш, мы мусім сягоньня сьцьвердзіць факт нябачанага дасюль росту нашае інтэлігэнцыі, нашага актыву.

Аднак, і сягоньня, як і раней, нарастаньне гэтых сілаў адбываецца ў ненармальных умовах. Раней гэта было выклікана чужацкім панаваньнем, сягоньня — жорсткімі ўмовамі вайны. Сілы, якія сягоньня ў шырокім маштабе прыймаюць удзел у грамадзкім жыцьці, адыграюць у будучыні вырашаючую ролю. Таму ўзгадаваньне іх павінна быць адным з найважнейшых заданьняў нашага руху. Мы, бязумоўна, не адкідаем вялікага значэньня прапагандыйнага ўзгадаваньня. Яно гартуе сілы, мабілізуе іх да актыўнае барацьбы за нашыя ідэалы, мала таго, яно падымае шырокія масы нашага народу й гэтым самым выкідае на бераг нашага адраджэньня здольныя й высокавартасныя элемэнты. Усё-ж прапаганднае ўзгадаваньне зьяўляецца, у большай, ці меншай меры, нягрунтоўным. Мы бачылі ўжо шмат прыкладаў, калі гэткі «новаўзгадаваны барацьбіт», прыехаўшы, скажам, з эміграцыі ў Нямеччыне й саткнуўшыся з жорсткай і часта цяжкой сапраўднасьцю, хутка апушчае крыльлі й губляе ўвесь свой запал да працы.

Вось чаму важна нам глыбей стаўляць справу нацыянальнага ўзгадаваньня нашых нарастаючых сілаў, перадаваць досьлед старэйшага пакаленьня малодшаму й прышчапляць яму сапраўды глыбака абаснаванае разуменьне нашае справы. Назваць сябе беларусам — гэта яшчэ ня значыць пазнаць Беларусь, пазнаць сябе, як беларуса. Гэтага мала. Трэба шмат перажыць, адчуць, прайсьці пэўны шлях практычнае працы й выпрабаваньня, зразумець і пазнаць працу нашых папярэднікаў. Тады толькі новы барацьбіт адчуе «радасьць сына, пазнаўшага маці», як кажа наш паэт Ул. Жылка, тады толькі ён пачуе сябе сапраўдным удзельнкіам Беларускага Адраджэньня.

Вялікае заданьне дзеля гэтага стаіць перад нашым старэйшым грамадзянствам, якое непахісна ішло беларускім шляхам: дапамагчы новай беларускай гэнэрацыі годна заступіць яго ў будучыні.

Шмат ёсьць сярод нашых старэйшых дзеячоў і барацьбітоў такіх, якія маглі-б перадаць традыцыі нашага руху малодшым і гэтым выдатна дапамагчы ў узгадаваньні ня толькі актыўнае моладзі, а й шырокіх народных масаў. Аднак, шмат хто недаацэньвае гэта. Ясна, што сучаснае пакаленьне загартуецца ў барацьбе й працы для сьветлай будучыні нашага народу. Але каб яно сталася вартасным будаўніком гэтае будучыні, яно павінна пераняць традыцыі нашага Адраджэньня.

Каваць сілы!

Наднёманскі

ПРА[illegible]ОВА ФЮРЭРА

З Галоўнай Кватэры Фюрэра, 1[illegible]ьня 1943 г.

Вечарам 10.9. Фюрэр сказаў прам[illegible] нямецкага народу з сваёй галоўнай кв[illegible] Мова была перадавана ўсімі радыёстан[illegible]

«Мае нямецкія суродзічы!»

Вызвалены ад прыгнятаючага [illegible]цяру, якім было ад даўжэйшага часу дл[illegible] прыгнятаючае чаканьне, я бачу, што [illegible] хвіліна, калі я магу гутарыць да ням[illegible] народу, не патрабуючы таіць і апраўд[illegible]а перад сабой і грамадзянствам. Наступ[illegible] ўпадак Італіі быў даўно прадбачаны, не ў [illegible]ьледку нястачы адпаведных італьянскіх [illegible]магчымасьцяў дзеля пасьпяховае абароны, тым больш не як насьледак адмовы, а лепш кажучы неахвоты гэтых элемэнтаў, якія ў выніку іхніх прадуманых плянова сабатажаў, пры[illegible]ьлі капітуляцыю. Бо чаго ад доўгіх гадоў намагаліся гэтыя людзі, гэта сталася цяпер: пераход італьянскага ўраду ад саюзнай Нямеччыны да супольнага ворага.

Калі Англія й Францыя ў верась[illegible]39 г. аб'явілі вайну Нямеччыне, Італія бы[illegible]ымушана ўмовай зараз-жа салідарна [illegible]бач з Нямеччынай. Пры гэтым гэтая [illegible]асьць была нятолькі ўгрунтаванай ум[illegible], але адначасна й доляй будучыні, як[illegible] гатавалі ворагі нятолькі Нямеччыне, але й [illegible]алії.

Гэта ёсьць агульна ведам[illegible]што Муссаліні меў цьвёрдую пастанову -[illegible] думцы пакту — загадаць зараз-жа мабілізацы[illegible] Гэтым-жа самым сілам, якія сяньня пра[illegible]лі капітуляцыю, удалося ў жніўні 1939 г. [illegible]недапусьціць Італіі ўступіць у вайну.

Як правадыр нямецкага народ[illegible]усіў мець зразуменьне для гэтых выняткова[illegible]нутраных труднасьцяў Дучэ. Дзеля гэтай прычыны я ані тады, ані потым не націскаў на Італію дзеля датрыманьня саюзьніцкіх забавязаньняў. Я пакінуў італьянскаму ўраду поўную свабоду, або наагул не прыступаць да вайны, а калі прыступіць, дык у той час, калі яны самы пастановяць.

У чэрвені 1940 г. Муссаліні ў[illegible] перамагчы нутраныя перашкоды, каб стаць Італії побач Нямеччыны. Вайна з Польшчай была свайго часу роўназначна дэцыдуючая, як у Нарвэгіі, так і супроць Францыі і яе саюзьніцкіх арміяў на сухапуцьці. Аднак я мушу Дучэ дзякаваць за становішча, якое, як мне ведама, унутры (ня супроць італьянскага народу, а толькі супроць адпаведных кругоў) — пры найвялікшых перашкодах мог правесьці.

Ад гэтага часу Нямеччына й Італія супольна вялі вайну; на шматлікіх баёвішчах пралілі супольна кроў; ані я, ані Дучэ ні на хвіліну не сумляваліся, што разьвязка гэтае вайны будзе рашучая: быць, або ня быць нашым народам. Таму Нямеччына, сама будучы ў найбольш цяжкім змаганьні аж да апошніх граніц магчымасьцяў памагала саюзьнікам.

Шмат прапазыкаў аб помачы, ад самага пачатку, мілітарнымі, італьянскімі, рашаючымі дзейнікамі адкідалася, або прымалася з немагчымымі для выпаўненьня засьцярогамі. Прыдзе час, калі можна будзе публічна даказаць, колькі Нямеччына памагала свайму саюзьніку ў супольнай вайне й нашто была прыгатаваная.

Нямецкі жаўнер прымаў такую паставу на ўсіх пляцох бою, якая заўсёды была яму характэрнай і без ягонага ўчасьця ўжо зімой з 1940 на 1941 год Італія страціла-б Паўночную Афрыку.

Імя маршала Роммэля ёсьць на вечнасьць зьвязана з гэтым нямецкім асягненьнем.

Калі на прадвесьні 1941 г. Нямеччына здэцыдавалася памагчы Італіі на Балканах, то гэта ня было выпаўненьнем собскіх намераў, але выключна дапамога саюзьніку, каб дзякуючы гэтаму зьліквідаваць небясьпеку, якая таксама пагражала й Нямеччыне. Нямеччына панясла гэтыя ахвяры тады, калі больш чымся трэба, мела сваіх клопатаў пад пагрозай з гадзіны на гадзіну чаканага бальшавіцкага ўдару супроць цэлае Эўропы. Кроў шматлікіх суродзічаў прыпячатавала саюзьніцкую вернасьць нямецкага народу.

Нямеччына й я, як яе правадыр, аднак маглі прыняць гэтае становішча толькі ўсьведамляючы, што на чале італьянскага на[illegible] стаяў адзін з найбольшых людзей, якія прынясьлі з сабой найнавейшыя часы, найбольшы сын італьянскае зямлі ад часу заняпаду антычнага сьвету. Ягоная вернасьць без засьцярогаў была зарукай пераможнага выніку. Яго адстаўка й агідная зьневага некалі ў будучыні прымуцца гэнэрацыямі італьянскага народу, як ганьба.

У апошні рашаючы мамэнт, калі даўно ўжо быў падрыхтаваны пераварот, у Дучэ-ж было жаданьне даць вышэйшыя паўнамоцтва дзеля больш рашаючага праводжаньня вайны. Жорсткія мерапрыемствы супроць адчыненых і тайных сабатажаў праводжаньня вайны, супроць рэакцыйных ворагаў сацыяльнай справядлівасьці павінны былі служыць здольнасьці да супраціву італьянскага народу. Мусоліні хацеў яшчэ ў апошнюю мінуту вылучыць падступных ворагаў свайго народу ў барацьбе: быць, або ня быць, каб так забясьпечыць будучыню Італіі. Зразумелы мой боль, які ахапіў мяне асабіста, адносна гістарычнае несправядлівасьці, што да гэтага чалавека. Ганебнае трактаваньне гэтага, які на працягу дваццаці гадоў жыў клопатам за свой народ, цяпер яго сапхнулі на плошчу простага праступніка.

Я быў і чуюся шчасьлівым, што так вялікага й вернага чалавека магу назваць сваім прыяцелям. Апрача гэтага я ня ўмею мяняць свае думкі ў залежнасьці ад патрэбы, або таксама выпірацца сказанага. Я веру, што міма шматлікага супярэчнага зразуменьня, таксама як у жыцьці паадзіночных людзей, так і народаў, вернасьць будзе незаступнай варатсьпю. Без яе грамадзкая арганізацыя хістаецца й, раней ці пазьней, мусіць заламацца. Апроч гэтага, пасьля тых ганебных ходаў, нямецкія аддзелы на Сыцыліі, нямецкія лятуны, залогі падводных і пасьпешных лодак, усялякага роду транспартных параплаваў і г. д. на сухапуцьці, у паветры й на моры выпаўнялі свае абавязкі ў найшчырэйшым зарысе.

(Працяг на 2-ой бачыне)

ПРАМОВА ФЮРЭРА

(Працяг з першай бачыны)

Сяньня, з тактычных прычынаў, ёсьць неабходна праціўніку шмат што прамаўчаць. У будучыні аднак будзе многае сьцьверджана, што толькі з выключаньнем ня шматлікіх бадзёрых італьянскіх адзінак ад гэтага часу ў першай лініі былі выключна нямецкія аддзелы, якія сваёй крывёй баранілі ня толькі Нямеччыну, а гэтымсамым й італьянскую зямлю.

Што цяпер італьянскі ўрад здэцыдаваў зламаць саюз і выключыцца з вайны, каб гэтым самым толькі цяпер з Італіі стварыць ваенную плошчу, вымагае, як заўсёды, уматываваньня прычынаў.

Іх можна разглядаць як неабходнасьць, але іх нельга ніколі апраўдаць, у сутнасьці-ж, што гэта сталася прынамсь без папярэдняе згоды саюзьніка.

І ня толькі гэта: у той-жа дзень, калі маршал Бадоліо падпісаў спыненьне ваенных дзеяньняў, паклікаў ён да сябе нямецкага прадстаўніка ў Рыме й запэўніў яго, што ён, маршал Бадоліо, ніколі ня здрадзіць Нямеччыну, што мы павінны мець да яго давер, і што ён дакажа сваімі чынамі, што варты гэтага даверу. Італія перадусім ніколі ня думае капітуляваць. Яшчэ ў дзень капітуляцыі кароль паклікаў нямецкага прадстаўніка й асабліва запэўняў яго, што Італія ніколі не скапітулюе, а толькі думае быць у саюзе супольна з Нямеччынай на долю й нядолю й верна стаяць па нашай старане. Так, яшчэ гадзіну пасьля агалошаньня здрады італянскі шэф гэнэральнага штабу Роата асьветчыў нямецкаму ўпаўнаважанаму, што гэтае паведамленьне зьяўляецца ардынарнай ангельскай хлусьнёй і прапагандай. У той самы час прадстаўнік італьянскага міністэрства замежных справаў запэўняў, што гэтая вестка зьяўляецца тыпова брытыйскім круцельствам, якое ён думае дэмантаваць, каб 15 мінут пазьней падаць да ведама, што, ясна, зґаджаецца й Італія запраўды выходзіць з вайны. У вочах дэмакратычных падпальнікаў вайны, як таксама й сучаснага італьянскага ўраду, такія ходы могуць разглядацца як бліскучы прыклад тактычна праведзенага дзяржаўнага мастацтва.

Гісторыя ў будучыні начай ацэніць і пакаленьні Італіі будуць сароміцца, што застасоўвалі падобную тактыку адносна прыяцеля, які крывёй і ўсялякага роду ахвярамі, выпаўніў свае абавязкі болей чымся толькі літарамі дагавору.

Мае суродзічы! Калі я ўжо ад двох гадоў меў нагоду наглядаць ўзрастаючы ўплыў гэтых варожых Нямеччыне рэакцыйных кругоў, гэтак сама супроцьнастаўленых сацыяльнай адбудове Італіі, ад часу адстаўкі Дучэ ані на хвіліну не сумліваўся, што да сапраўднага намеру гэтае зьмены рэжыму.

Таму я загадаў прадпрыняць усе неабходныя меры, якія-б спатрэбіліся ў гэтым выпадку, каб бараніць Нямеччыну ад небясьпекі, якую падрыхтаваў маршал Бадоліо з сваім асяродзьдзем, ня толькі Дучэ і італьянскаму народу, а таксама й Нямеччыне, якую хацелі туды-ж кінуць. Інтэрэсы нацыянальнага прадаўжаньня вайны ёсьць нам аднолькава сьвятымі як і абавязваючымі. Мы ўсе ведаем, што ў гэтым бязлітасным змаганьні на жаданьне нашых ворагаў пераможаны будзе зьнішчаны й толькі пераможца павінен мець магчымасьці на жыцьцё.

Таму мы хочам знайсьці такія прадпрыняцьці ў халоднай рашучасьці ў вяліхіх і малых справах, якія нам патрэбныя, каб зламаць надзеі нашых ворагаў. Да гэтага шматлікія ганаровыя італьянцы толькі цяпер маюць нагоду асьветчыцца як неразарвальна злучаныя ў змаганьні абодвух народаў.

АДПАД ІТАЛІІ ПАД МІЛІТАРНЫМ ПОГЛЯДАМ МАЕ МАЛОЕ ЗНАЧЭНЬНЕ

Змаганьне ў гэтай краіне, ад шматлікіх месяцаў, праводзілася ў першай лініі нямецкімі сіламі. Цяпер мы будзем прадаўжаць яго без ніякіх абцяжаючых гамаваньняў.

Спроба міжнароднае плютакратычнае шайкі зламаць нямецкі, як і італьянскі адпор, зьяўляецца дзяцінадай. Яна зьмешывае нямецкі народ у гэтым прыпадку з іншым. Іхныя надзеі, што сяньня знайдуць яны здраднікаў, падобна як гэта было з Італіяй, паказваюць на поўнае нязнаньне сутнасьці нацыянал-сацыялістычнае дзяржавы.

Іхныя надзеі, што й у Нямеччыне ўдасца ім правесьці 25 ліпеня, апіраюцца на аснаўной памылцы, адносна й майго асабістага становішча, як і гэтаксама паставы маіх палітычных супрацоўнікаў, маіх маршалаў, адміралаў і гэнэралаў.

Цяпер болей, чымся калі-колечы раней, супроць гэтага намаганьня выступае фанатычна сцэмантаванае нямецкае кіраўніцтва. Усялякія цяжкасьці ў нашым здэцыдаваньні будуць нас толькі ўзмацняць. Асабістае жыцьцё для мяне ўжо даўно не існуе. Я працую ў перакананьні й у пачуцьці абавязку, што сваім жыцьцём служу будучыні майго народу й пакаленьняў.

Што я маю падставу без засьцярог верыць у посьпех, на гэта паказвае ня толькі шлях майго собскага жыцьця, але гэтаксама й уздым нашага народу.

У 1939 г. мы мусілі адныя прыняць аб'яўленьні вайны ад нашых праціўнікаў. Мы паступалі як Кляўзэвіц, які ўва ўсякіх абставінах лепш выбіраў геройскае змаганьне, чымся трусьлівае ўступленьне. Дзеля таго я яшчэ 1 верасьня 1939 г. у Райхстагу заявіў, што ані, час, ані насільле аружжа гэтым разам ня зломяць нямецкага народу.

Ад гэтага часу ў першай чарзе, дзякуючы нашай собскай сіле, вораг часткова быў адкінуты на болей за 1 000 км. ад нямецкае граніцы. І толькі з паветра намагаецца ён тэрарызаваць нашую бацькаўшчыну. І ў гэтым прыпадку нятолькі прадпрынята тэхнічна й арганізацыйна абарона каб ягоныя тэрарыстычныя напады поўнасьцю заламаць, а каб пасьпяховымі прадпрыняцьцямі і адплаціць.

Толькі тактычныя неабходнасьці маглі нас прымусіць час ад часу на фронце нешта адступіць у гэтым гігантцкім змаганьні, або нешта ўсунуцца пад асаблівай пагрозай, аднак ніколі ня будзе разьбітым стальное колца, што акружае нямецкую бацькаўшчыну. Яно захаваецца дзякуючы гэройству й крыві нашых жаўнераў й абароніць нашае гаспадарства.

Я лічу, што якраз цяпер народ, ня гледзячы на пашкоджаныя гэтай жорсткай вайной паасобныя вокругі, выпаўніць свае абавязкі. Усе дадзеныя ёсьць на гэта, каб верыць самым сабе.

Партыя ў гэтым мае быць прыкладам. Бацькаўшчына з гордасьцю можа глядзець на сваіх жаўнераў, якія нясуць гэраічна ахвяру крыві ў найцяжэйшых абставінах заўсёды выпаўняюць свой абавязак. Фронт аднак мае ў сабе поўныя цярпеньня часіны, у якіх папросту вымагаецца надлюдзкага высілку праз доўгія тыдні й месяцы, прыпамінае сабе бацькаўшчыну, якая гэтаксама сяньня зрабілася фронтам, з гэтым толькі, што тут гэройства даказваюць старыя, хлапцы, маткі жанчыны й дзяўчаты. Дзеля гэтага сьвятым абавязкам кажнага жаўнера зьяўляецца яшчэ болей, чымся дагэтуль праявіць найвышэйшую стойкасьць і тое рабіць, чаго вымагае барацьба. Нямецкі народ ува ўсёй ягонай гісторыі запраўды ніколі ня быў больш горды з самога сябе, як у гэтым найбольшым змаганьні нашых часоў.

Аб гэту волю й гэтыя чыны будуць разбітыя й зьнішчаны ўсе намеры зрабіць з Нямеччыны паднявольную нацыю.

Кожны немец ня гледзячы на тое, на якім ён становішчы, павінен сабе здаваць адчот, што ад яго самога, ад ягонага ўдзелу й ахвярнасьці залежыць утрыманьне нашага народу й будучыня шматлікіх пакаленьняў.

Дзеля таго я магу ня толькі славамі дзякаваць нямецкаму народу, мужчынам й жанчынам, бацькаўшчыне й жаўнерам на фронце за гэта ўсё, што яны робяць, што яны ахвотна пераносяць і церпяць. Гэтую падзяку вынясуць некалі будучыя пакаленьні ў прасьведчані гэтага, што іхнае вольнае й сацыяльна справядлівае жыцьцё зьяўляецца асягненьнем ахвяраў нашага часу.

Я сам чуюся бязьмежна гордым з таго, што магу быць правадыром гэтага народу й дзякую Богу за кажную гадзіну, якою мяне абдарае, маёй працай правесьці ўдачна найбольшае змаганьне нашае гісторыі.

Прадузятыя прадпрыняцьці, якія ў сувязі з падзеямі ў Італіі дзеля абароны нямецкіх інтэрэсаў, яўляюцца надта цьвёрдымі. Як далёка яны адносяцца да Італіі, дык гэта бачно з таго як там яны ўжо праводзяцца плянава й удачна. Прыклад здрады Югаславіі ўжо раней даў нам неабходнае паясьненьне й поўнавартаснае зразуменьне.

Прыклад самое Італіі можа быць аднак і для нас навукай, каб у хвіліне найбольш цьвёрдага напружаньня, найбольш горкай бяды ніколі не павінны выступіць супроць запаведзі народнага гонару, верна стаяць побач свайго саюзьніка, верным сэрцам выпаўняць усё тое, чаго ад нас вымагае абавязак. Напасьледак Усемагучы, як нагароду, дасьць лаўровы вянок для народу, які гэты экзамэн здасьць, каб гэтым-жа мог асягнуць заплату за сваё жыцьцё. Гэта аднак мусіць і будзе пры ўсякіх абставінах Нямеччына.

Гэнэральны Камісар Беларусі Гаўляйтэр
ВІЛЬГЭЛЬМ КУБЭ
замардаваны ўначы на 22-га верасьня ў Менску.

Падрабязнасьці ў наступным нумары.

Вайна

Спосаб вядзеньня вайны ў гэтым годзе характарызуецца пасьпяховай абаронай нямецкага [illegible]мандаваньня супроць трох афэнзываў англя-[illegible]канцаў і бальшавікоў. У свой час у Лёнд[illegible] у Вашынгтоне пакладалі вялікія надзеі [illegible]арыстычныя чапады, якія мелі зламаць [illegible] й становкасьць у далейшым вядзень[illegible]ны сярод нямецкага цывільнага насель[illegible]. Ня гледзячы, аднак, на ўсю цяжкась[illegible]ю спрычынілі гэтыя варварскія мэтады [illegible]ньня вайны, варожыя надзеі ня зьдзе[illegible]ся.

В[illegible] надзеі пакладаліся пасьля на бальшавіц[illegible] афэнзыву. Але вайсковыя спэцыялісты ў [illegible]ане й у Вашынгтоне ацэньваюць у бальш[illegible]ытуацыю на ўсходнім фронце на карысь[illegible]ямецкага камандаваньня, указваючы прыг[illegible]м на знамянітую нямецкую тактыку па[illegible]яховага манэўраваньня. Пры гэтай тактыцы бальшавікі паносяць кожны дзень вялікія страты ў людзкім і ваенным матарыяле. Калі нават на працягу апошніх ваенных апэрацыяў былі пакінуты бальшавіком некаторыя абш[illegible]ры, дык іх ніколі ня можна пераацэньваць, бо вартасьць іх ніколі ня выраўняе тыя страты, якія бальшавікі пацярпелі ў гэтых баёх.

На[illegible]асійск быў пакінуты, бо гэты горад і порт [illegible]маюць ужо для далейшага вядзеньня вайн[illegible]кае вартасьці. 10 верасьня пачалі бальш[illegible]садку сваіх войскаў у яго порце. Нямец[illegible]даваньне пастанавіла пакінуць яго, пасьля [illegible]о, калі ўсе ўладжаньні тут былі зьнішчаны [illegible]сам порт прывялі ў такі стан няпрыгоднась[illegible] што бальшавікі могуць пры вялікім ужы[illegible]і тэхнічных сілаў карыстацца ім не раней [illegible]а 1944 г. Калі мы правядзем лінію фронту [illegible]лей на поўнач, дык яна праходзіць каля П[illegible]тавы, Нежына, уздоўж рэчкі Дзясны й д[illegible]й каля Смаленску. Бранск быў пакінуты, [illegible] скараціць лінію фронту й змагчы лёгка[illegible]біць усе далейшыя бальшавіцкія атакі.

Тактыка манэўраваньня асягнула тое, што бальшавікі не маглі зьдзейсьніць свае пачатковыя ваенныя мэты. З самага пачатку летніх баёў на ўсходнім фронце нямецкае ваеннае камандаваньне пастанавіла: шанаваць свае уласныя сіль[illegible]й, як мага, найболей нішчыць ворага. Бязу[illegible]оўна, такую тактыку можна было застасаваць толькі прыймаючы пад увагу вялікую духовую сілу й вялікую мараль нямецкага жаўнера, які дае гваранцыю, што ён і далей [illegible]агул утрымае ўсходні фронт непарушным.

Тр[illegible] афэнзыва, якую распачалі ворагі ў гэты[illegible]эе, была на Міжземным моры. І тут гала[illegible]енных спэцыялістаў гавораць аб тым, [illegible]гэтая афэнзыва мусіла быць выкуплена [illegible]ю вялікіх ахвяраў. Нават сярод найцяж[illegible]х ваенных і палітычных абставінаў, ня г[illegible]чы на вялікую перавагу ворага ў людзк[illegible]энным матарыяле, ён усюды наткнуўся [illegible]шучы супраціў нямецкага жаўнера, які [illegible] пераходзіў да зьнішчальных для ворагу [illegible]р-наступаў. Далейшае разьвіцьцё ваенн[illegible]эрацыяў у Італіі ў сучасны мамэнт цяж[illegible]адбачыць. Нямецкае камандаваньне, адн[illegible] тут знойдзе найболей мэтазгодныя мера[illegible]ствы для пасьпяховае абароны. Адно можна сказаць, што баёвая сіла й мараль нямецкага жаўнера й тут, як і на ўсходнім фронце, пераканае ўсе цяжкасьці.

На ўсходнім фронце бальшавікі намагаюцца з вялікімі сіламі пяхоты, танкаў, самалётаў і ар[illegible]тылерыі й далей праламаць нямецкія па[illegible]цыі. Да апошняга часу гэта ім нідзе не ўдалося. На поўнач ад Азоўскага мора, у раёне сярэдняга Дняпра, Палтавы,Раслаўля, на захад ад Ельні, на поўдзень ад Белага, у раёне Смаленска й на поўдзень ад Ладажскага возера ўсе атакі ворага адбіты з вялікімі для яго крывавымі стратамі.

За мінулы тыдзень вораг страціў 549 танкаў і некалькі сот самалётаў.

Італьянская падводная лодка затапіла на Чорным моры адну бальшавіцкую міналоску. Англя-амэрыканскае камандаваньне пасьля высадкі ў Салерно мела на мэце акружыць нямецкія аддзелы ў Калябрыі й Эпуліі. Гэта, аднак, яму не ўдалося. Дзякуючы контр-атакам усе нямецкія ваенныя часьці змаглі плянова, у поўным парадку выйсьці з гэтых правінцыяў і прыняць удзел у баёх каля Салерно. У выніку цяжкіх баёў вораг панёс вялікія страты: звыш 10.000 забітых і раненых, 4.429 палонных, 153 танкаў, 54 гарматы, 62 гранатамёты й шмат іншага ваеннага матарыялу. Ад 8 да 17 верасьня тут было зьнішчана: 3 крэйсары, 2 зьнішчальнікі, 1 тарпэдная лодка, 15 дэсантных лодак і 9 транспартных караблёў на 58.000 БРТ. Акрамя таго былі вельмі цяжка пашкоджаны: 2 крэйсары, 3 зьнішчальнікі, 1 дэсантная лодка, 1 вялікі танкер і 7 транспартных караблёў на 35.000 БРТ. У ваенным адношаньні яны таксама лічацца за зьнішчаныя. Далей было пашкоджана некалькі ваенных і 125 транспартных караблёў і танкераў на 600.000 БРТ.

Акрамя таго, каля берагоў Італіі былі зьнішчаны: 1 зьнішчальнік клясы Эрвіс, 1 танкер, 1 тарпэдная лодка, 2 вылаўлівачы мінаў, 2 старажавыя караблі, 3 параплавы, 1 вялікі параплаў на 14.500 БРТ, 2 вялікія хуткабежныя лодкі й адну працуючую для ворага падводную лодку — «Каксоніс». Каля Гібральтару нямецкія падводныя лодкі затапілі 3 варожыя зьнішчальнікі, 1 карабель-халадзільнік і 1 ветразны карабель. Над Атлянтыкам быў зьбіты 1 паветраны карабель.

Нямецкае лятунства цяжка збамбардавала ваенныя аб'екты ў ваколіцах Лёндану й у паўднёвай Англіі.

Варожае лятунства цяжка збамбардавала Ізноў Парыж і Нантэ. Былі прычынены вялікія матарыяльныя шкоды ў жыльлёвых памешканьнях, насельніцтва мела значныя страты ў забітых і раненых.

Ад пачатку вайны да 16 верасьня 1943, як паведамляе японскае ваеннае камандаваньне было зьбіта 7.000 амэрыканскіх самалётаў.



Гняздо супраціву саветаў.
Разьбітыя агнём нямецкае артылерыі ляжаць салдаты й аружжа.

—o◆o◆o—

Амэрыканскія страты ў караблёх

Марское міністэрства ў Вашынгтоне падало да ведама, што ад 7-га сьнежаня 1941 г. флот ЗША страціў 114 ваенных караблёў. З гэтай лічбы 88 адзінак затоплена, 9 зьнішчана, а 17 марское міністэрства было змушана прызнаць страчанымі.

У вапошнім часе ЗША страціла таксама вялікі зьнішчальнік «Рован», які меў 1 500 тонаў водавыціску і 172 асобы экіпажу. «Рован» вайшоў у строй толькі ад часу выбуху вайны.

З беларускага жыцьця

Беласток

ВЯЛІКАЯ ПРАЦА

(ДА КАНЦЭРТУ 18. 9. 1943 г.)

Дня 18. 9. 43 г. у памяшчэньні Кінатэатру «Капітоль» адбыўся канцэрт Беларускага Хору і Аркестру пад агульным кіраўніцтвам ведамага беларускага кампазытара З. Арлова.

Канцэрт быў наладжаны Беларускім Аб'еднаньнем у Беластоку для слухачоў цяпер трываючых настаўніцкіх курсаў.

Канцэрт пачаўся песьняй «Мы-арлы», музыка З. Арлова да слоў эдольнага беларускага паэта Ю. Сяргіевіча. Песьня гучыць сільнымі акордамі і здаецца, што гэта ў маршы да свабоды шагае беларуская моладзь.

Льлюцца песьні адна за другою, як-бы здаганяючы адна другую, усе прыгожыя і родныя, мілыя сэрцу.

Поўная лірызму песьня «Лапці» ў выкананьні Хору (солё Баданін, тэнар) і «Нёман-рака» (солё Богуш Л., бас), робяць асабліва ўражаньне. Вельмі добра была таксама выканана песьня «Ах ты дуб'я, ты бяроза», бадай найлепей з усіх.

Кожную новую песьню саля вітае бурнымі воплескамі. Няма ніводнай песьні, каб не падабалася публіцы. Усе яны з такою дакладнасьцю перададзены, што кожны адчувае не вялікі чар, чар беларускае народнае песьні.

З задаваленьнем можна сьцьвердзіць, што за гэты час хор зрабіў вялікі шаг наперад.

Далей былі паказаны беларускія народныя танцы, каторыя заваявалі сымпатыю публікі. Нашая беларуская публіка вельмі любіць танцы. Найбольш спадабаўся гумарыстычны танец «Янка» (у выкананьні А. Баданіна і І. Крутуль), аб чым сьведчыць букет кветак.

У другой частцы мы чулі таксама й струнны Аркестр пад кіраўніцтвам А. Кавальчука, які ў гэтым выступленьні быў у надзвычайнай форме.

Акрамя гэтага выступіла гр. Мілёнушкіна ў некалькіх салёвых нумарох. Гр. Мілёнушкіна ведама беларускаму грамадзянству Беласточчыны з розных канцэртаў у розных мясцовасьцях. Трэба спадзявацца, што ў будучыні гр. Мілёнушкіна займе адно з выдатных месцаў у нашым беларускім тэатры. На заканчэньне былі адсьпяваны беларускі нацыянальны гымн.

Наагул канцэрт зрабіў на ўсіх вельмі прыемнае ўражаньне.

МІХ. ПУШЧАНСКІ

Менск

Хачу служыць Бацькаўшчыне.

Моцны сон па даўгім, утомным пад[арожжы] прабівае песьня сталёвае птушкі, якая ў ран[нім] летнім сонцы плыве над горадам [шляхам] ясных воблакаў.

Гэта песьня змаганьня, песьня пера[мог]... та песьня маладосьці. Вітаем новы дзен[ь]... цыі, абавязкаў і новых думак, якія згр[уп]... маладых беларускіх дзяўчат у Саюзе [Бел]... кае Моладзі на спартовых курсах у М[енску].

З сумам абягаюць вочы руіны [га]... сэрцу гораду, але адначасна з верою... род іх красуе новае жыцьцё, пачатае... маладых пад сьцягам бел-чырвона-бел[ым].

«Люблю наш край, старонку гэт[у]... радзілася, расла...» — плывуць с[ловы]... праменьнямі ўсхваляваныя словы... ... дых вачох чароўныя абразы роднага к[раю]... сэрцах гатовасьць бараніць яго ад... зьнішчальных рук.

Працавіта праходзяць гадзіны [на]... вые заняткі, экскурсіі, песьні, гутар[кі]... клады на розныя тэмы запаўняю[ць]... кожны дзень, даючы багаты матэрыя[л]... карыстаньня ў новых дружынах СБМ.

На дакладах вядуцца часам нава... дыскусіі, нярав з моцным расхвалява[ньнем]... з бліскам агня ў вачху. Гэта гаворы[ць]... досьць, якая бунтарна, з надзеяй буд[учы]... новы легіны, дасканальнейшы сьвет, ... адчуваецца глыбокае, магутнае пачуцьцё ... вязанасьці да роднае зямлі, адчуваецца шчырае беларускае сэрца.

З вясёлай песьняй, бадзёра прайш[ла]... тымі летнім сонцам вуліцамі гораду [за]... сьля беларускія дзяўчаты на вызначане месца ўрачыстае ў важныя часіны.

Пры кіраўніцтве штабу СБМ ... спортовых і гаспадарскіх курсаў ... служыць і змагацца за шчасьце й ... ларускага народу й Бацькаўшчыны.

«Адміністрацыйная школа для [Беларусі]»

Адміністрацыя краю й народу ... частыя зьмены, патрабуе, каб ... да яе асобы аэнаёміліся з ... Праведзеныя... ... годзьдзем школьныя лягеры далі а... дрыя вынікі, так што гэтая ідэя ў... цца цяпер таксама й на Беларусі. ... мэту зарганізавана «Адміністрацыйная школа Беларусі» ў Менску, якая пачынае ... працу канферэнцыяй судзьдзяў зямельных спраў. Наступныя курсы абыймуць вялікую колькасць беларускіх настаўнікаў. Далей наведваюць школу ўрадоўцы агульнай адміністрацыі й фінансавага кіраўніцтва. Удзельнікі курсаў, якія будуць склікацца з усяе тэрыторыі Гэнэральнага Камісарыяту Беларусі, за час свайго бытаваньня ў школе — атрымоўваюць памешканьне й харчаваньне. Гэтым даецца магчымасьць кожнаму паасобку па сканчэньні дзеннага навучаньня разам з іншымі ўдзельнікамі абмеркаваць тэмы дня.

Варшава

Перад новым школьным годам.

У нядзелю 29-га жніўня, у кватэры Беларускага Камітэту адбыўся сход бацькоў і апякуноў дзяцей школьнага веку.

У дакладзе аб узгадаваньні дзіцяці, кіраўнік культурна-асьветнага рэфэрату БКС кс. Татарыновіч падчыркнуў вагу ўзгадаваньня ў нацыянальным духу, у роднай мове.

Наступна Др. М Шчорс, кіраўнік БК., у сваёй прамове даў канклюзыю, што беларуская школа зьяўляецца кузьняй будучыні нашага народу. Дзеля таго кожны беларус павінен узгадоўваць свае дзіця ў беларускай школе. Кіраўнік 1-й Беларускай Пачатковай школы ў Варшаве, гр. Мальчын, схарактарызаваў корат-ка карысьць навукі ў роднай мове, заклікаў запісываць дзяцей у родную школу.

На заканчэньне сходу адбыліся выбары бацькоўскага камітэту на новы школьны 1943 -44 год. У склад камітэту ўвайшлі: гр-кі Крываль і Федарчук, і гр-не Война, Ганановіч і Казяронак.

Ганцавічы

Калі ў верасьні 1941 г. на Беларусі была ўстаноўлена цывільная адміністрацыя, Ганцавічы не прадугледжваліся на акруговы цэнтр. Асобныя паветы належалі тады да Баранавіцкае, Слонімскае й Слуцкае акругаў. Але гэткае адміністраваньне з прычыны камунікацыйных цяжкасьцяў было нявыгодным. Таму ў 1941 годзе была створана Ганцавіцкая акруга, на чале якой быў пастаўлены рэгірунгсграт Вільлі Мюлер.

Каб забясьпечыць лучнасьне акругі з вонкавым сьветам, трэ' было насампершу адбудаваць дарогі да чыгункі Берасьце—Слуцак. Гэта ўдалося зрабіць за кароткі час. Адначасна была пераштыта чыгунка з Баранавічаў у Лунінец, чаму ўвесну 1942 г. акруга мела ўжо добрае лучнасьне. У выніку гэтага пачаўся ў вялікім памеры вываз будаўлянага й паліўнага дрэва з акругі. Лясное багацьце акругі выклікала адпаўленьне ляснога прамысловасьці для важных ваенных мэтаў. Таксама і ў галіне земляробства можна адзначыць паважныя вынікі. Дарма што цяжкасьці, пастаўкі выконваліся добра. З асаблівай энэргіяй вяліся працы ў галіне адбудовы гаспадаркі. Прамысловасьць і гаспадарка былі поўнасьцю зьнішчаныя, іх трэ' было стварыць з нічога. Дзякуючы пляноваму дабору й выкліканьню мясцовых сілаў, акруга мае сягоньня досыць сьпэцыяльных працаўнікоў, што дазваляе ўзяцца за адбудову прамысловасьці ў паветах. Выраблены тавары перадаюцца галоўна таварыству ПТО, у якасьці замены тавараў за земляробскія прадукты.

Слонім

Маладыя настаўнікі павышаюць сваю кваліфікацыю.

Надоечы скончылі сваю працу курсы павышэньня кваліфікацыі маладых настаўнікаў акругі. Вынікі экзаменаў паказваюць, што як выкладчыкі, так і слухачы сумленна ставіліся да сваіх абавязкаў, разумеючы тое, што новае пакаленьне беларусаў мусіць мець добрых настаўнікаў і ўзгадавальнікаў.

Канцэрт паліцыйнае аркестры

У нядзелю 29 жніўня ад 16.30 да 18 гадзіны, у Менскім парку адбудзецца канцэрт аркестры нямецкае паліцыі, каторая ў падарожжы на Остляндзе наведала Баранавічы.

ЛАРЫСА ГЕНІЮШ

Выйшлі сяньня...

Выйшлі сяньня з палосак мы вузкіх
маладою, адважнай сям'ёй
бараніць родны край беларускі
сваёй сілай, сваёю крывёй.

Годзе нам ужо зьдзеку і мукаў,
пад чужым годзе кленчыць ярмом;
сяньня ў нашы юнацкія рукі
долю роднай Краіны бяром.

Йдзем праз сёлы бадзёрым мы маршам,
з намі сьледам уздым маладых...
Звонкай песьняй братоў усіх нашых
ў беларускія клічам рады.

Б'юць нам ветры ў юнацкія грудзі,
цьма чужая блытае паход —
ўсё-ж мы родныя сёлы разбудзім,
ўскалыхнем сакаліны народ.

Нас ніхто ужо больш ня прымусіць
слухаць зьдзеку прыблудаў чужых
«Хай жыве наш Народ Беларускі!»
кінем кліч ад мяжы да мяжы.

Сярод бураў стыхіі сусьветнай
мы сягоньня ў стройных радах;
Беларусь — гэта нашая мэта,
а над намі народны наш сьцяг.

М. ЛЯСУН.

НА КРЫЖЫ

Раскажу я вам, мае сябры, адну гісторыю — лёс аднае сям'і. Гэтая гісторыя кожнаму з вас, быць можа, нагадае не адну такую гісторыю, у якой, так ці інакш, былі зачэпленыя вашыя блізкія — сваякі або сябры.

Жыў у нас на засьценку чалавек. Жыў сабе проста, гаспадаркі вялікай ня меў: шасьць дзесяцін зямлі, добры конь, са тры каровы, авечкі ды іншае. Адно, што можна пра яго сказаць, што ён быў працавіты й хлеба не пазычаў, і меў які-колечы лішак, так, што меў нават адна дачка яголая, Раіна, і гімназію скончыла.

Раптам, — гэта было ўвосень 1929, а мо' і у 1930 годзе — заходзіць да яго, якраз у часе сьнеданьня, старшыня сельсавету Хвёдарка Скураток — можа знаеце яго; да вайны ўсё на скрыпцы вясельле па вёсках граў. А з ім заходзіць сакратар партыйнай ячэйкі Янук Бізун, асоба таксама выдатная — карпёжнік на ўсю воласьць, п'яніца, буян; у 1919 годзе папоў усё пастрыгаў. Заходзяць, ні слова на кажучы, садзяцца. Няёмка неяк Богушу — так звалі таго гаспадара: запрасіць-бы за стол, ды страва занадта звычайная, ятчэ пакрыўдзяцца: «Чым частаваць наважаў куляцом нейкім. ніби ясчні няма з чаго сылачы». Пачаць смажыць што якое, дык мо' яны сьпяшаюцца куды?

Урэшце Богуш пытаецца:

— У справе якой, ці можа так... у госьці прыйшлі?

— У справе, — адказалі тыя, што прыйшлі, а самі пераглянуліся й усьміхнуліся.

— А ў якой такой справе? — цікавіцца Богуш.

— Ты ня прыкідайся дурнем — адказвае больш языкасты Янук. — Табе ўжо [даўно] ... ведама...

— Бог з вамі Каб мне што-небу[дзь] ведама? Пра што вы гаворыце? ... што мне нічога невядома.

— Ты падатак заплаціў?

А трэба сказаць, што Богуш усе[гды] заўсёды акуратна плаціў. Вывала, з ... небудзь упрошца, дык і то ён будзе га[варыць]: «Як-жа, трэба заплаціць. Мы павінны, ... казаў, свае адбыць». Якое-ж было яго ... леньне, калі яму сказалі пра падатак ...

— Я не заплаціў? Ці вы жарту[еце]... проста паздзекавацца хочаце?

— Адным словам, мы прыйшлі апі[сваць]... ёмую маёмасьць.

Тут Богуш і зусім разгубіўся. Га... яму міргае: «Квіт, квіт пакажы. Ён ... вунь там, у дзюрцы над брусам...» ... стаіць, аслупянеўшы. Крыху апрытомнеў... пытаецца: — А паперы ў вас ёсьць ... які?» — нібы думаў іх спалохаць ...

Скураток астаў з свайго запінальн... партфэлю паперу, у якой было сказана, што «гаспадарка Богуша, якая ў мінулым ... выкарыстоўвала найманую працу і як за... абкладаецца індывідуальным падаткам»...

Скураток склаў партфэль і сказаў: — ... заўтра да дванаццаці ня ўнясеш той ... дык усё тваё будзе распрададзена. А ... на, расьпішыся.

Якое гора ахапіла ўсю Богушаву сям'ю, калі Скураток з Януком выйшлі з хаты. Каб у Богуша былі грошы, дык ён, можа быць, павярнуў-бы гэтую справу як-небудзь інакш. А то, кішэні ў чалавека пустыя: адных тры чырвонцы было ў яго, якія прысылала дачка Раіна ў нядзелю. Прадаць што, дык дзе-ж пасьпееш да дванаццатай заўтра, ды і каб Богуш прадаў паўгаспадаркі, дык усёадно не хапіла-б — гэтульні наклалі на яго. Паўвека зьбіраў чалавек пакрысе, марыў, спадзяваўся, не даядаў, не дасыпаў, а тут аддай усё... Ды яшчэ мо' і самому давядзецца нарыцца за кратамі.

Страшэнная ноч была тая для Богушавых. Сыночак Юльяш, такі здатны хлапчук, каб нічога ня чуць і ня бачыць, загарнуўся ў коўдру, трасецца ды і сам плача.

Раптам бразгат у шыбу. Тут усе і памлелі. А маці стала на калені, склала рукі на грудзёх і моліцца: «Ойча з неба, Божа, зжалься над намі...» І тады толькі падышла да вакна. Бразгат паўтарыўся.

— Хто тут?

— Гэта я. Адчыніце.

Якая радасьць ахапіла ўсіх, калі пачулі голас Зенькі. Юльяш выскачыў з-пад коўдры, пабег адчыняць. З бразгатам адсунуў засаўку.

— Заходзьце, Зенька.

Дзьверы адчыніліся і праз сьветлую пляму ў сенцы ўсунулася вялікая постаць Зенькі.

— Што гэта вы сяньня гэтак рана?

Як толькі Зенька ўвайшоў у хату, гаспадыня залементавала.

— Зенечка, родненькі, скажы, што на сьвеце чуваць, — усё-ж такі ты больш за нас мусіш ведаць. (У Зенькавай хаце за перагародкай была канцылярыя сельсавету).

— Ды нічога добрага, — пачаў Зенька.

Раптам з палацяў пачуўся крык Богуша, ды такі страшэнны, нейкі вар'яцкі, што ўсе ў хаце аж перапалохаліся.

— Гэта яны... ідуць...

— Богуш, Богуш. — паклікала, устрывожаная, жонка.

Богуш прачнуўся, сеў на палацях і, азіраючыся на хату, загаварыў:

— Ох, ты, Божа. Сон ды такі брыдкі, — ніколі, здаецца, такога ня сьніў. Здаецца, я адзін у полі. І, здаецца, крумкачы крулцяць, круцяцца. А я зьнясілены і зусім галодны: кропелькі вады некалькі дзён ня было ў роце. І ледзь дыхаю я. А яны ўсё бліжэй, бліжэй. А ў мяне голыя рукі. І з кіпцюрамі ўсё, з кіпцюрамі да мяне, а вочы ў іх прагныя, крывавыя. Божа ты мой. Я ўсё вочы плюшчу, плюшчу, хачу махнуць рукою, рука не паварочваецца, крыкнуць — язык апнямеў. А яны ўжо і да вачэй дабіраюцца — выдзяўбуць мне вочы...

Крумкачы? — пытае Богушыха.

— Крумкачы, — адказвае, усё яшчэ над уплывам сну, Богуш.

— Гэта нашыя ворагі — тыя крумкачы. Круцяцца яны, круцяцца, хочуць нашае крыві... Сьвятая царыца Маці, выратуй нас...

— Што выраблюць? — раптам гаворыць Зенька. — Надысь, дык завязалі дзьверы знадворку ў хаце Міхалкі і вывелі карову. А ўчора, дык у Аўдоці кублы трэсьлі. І што там трасьці, у той удавы?

— А чаго яны шукалі у кублах?

— Быццам страхоўку не заплаціла.

— Няўжо пра гэта ў раёне ня ведаюць?

— Мо' і ведаюць?.. Мо' і ў цэнтры ведаюць...

— Ўладзюга Янук усім гэтым верхаводзіць. Выгадавала маці сынка на гора людское. Тады, як яшчэ падлеткам быў да сала ўкраў у Грыпіны, каб выдалі ўрадніку, не пашкадавалі, дык мо' цяпер людзі дзякуй сказалі-б...

— Здаецца, і да вас сяньня ўраньне заходзілі? — цікавіцца Зенька.

Богушыха адказала, што заходзіў Янук і Хвёдарка Скураток.

Тады Зенька стаў расказваць, як, вярнуў-

Па савецкім Саюзе

(Працяг)

Барысаў. Заходзім у сталоўку. Пакуль мы дачакаліся месца за сталом, нам добра падцягнула жываты. Было холадна. Мы пастанавілі паабедаць, не распранаючыся. Нарэшце, селі, сядзімо. Але што за ліха! Абеду ня прыносяць. Аказалася, гэта сталоўка «сталінская», дык трэба распранацца

— Ды ў вас холадна, грамадзянка! — кажу я.

— Як-жа ж тут распранацца.

Але перакопваньні нічога не памаглі. Раз «сталінская» сталоўка, дык нічога ня зробіш. Мерзьні, а распранайся. Мне гэтак прыемна сядзець. Ногі ныюць, морыць сон. Кідаюся на хітрыкі.

— У мяне, гражданка, цэлая куча вошаў.

— Вешай, все равно

Мы зьелі, называецца, абед, але есьці хочацца. Прыпамінаю родны край, як калісь сярод сваіх людзей бяседа шумная На стале... Пустая талерка навявае ўспаміны мінулых дзён... Шчасьлівае і радаснае жыцьцё...

Смаленск. Усё бліжэй да месца працы Нас вязуць у Арол. Вось табе і Данбас! У Смаленску нас частуюць такой кіслай капустай што верне, як успомніш. Усе чмыхаюць пасьля кожнае лыжкі.

Ізноў едзем, і нас захоплівае ноч, толькі сьнег бялее ўдалі. Холадна. Я тулюся ў каўнер, хаваю рукі. Далёка родны край.

Уночы ў Арле нас загналі ў лазьню. Удзень мы працавалі над расчысткай сьнегу Нам хочуць спадабацца «таварышчы». Вечарам гоняць нас усіх у клюб, і помполіт прачытаў даклад аб «советских достижениях». На заканчэньне ён зьвярнуўся да нас:

—Товарищи! Кто имеет какие требования?

— Браво! — пачулася ў вадказ.

Дамаганьні!? Сьмяешся, брат! Няма дурняў. Я ўжо пазнаў, як гаварыць праўду ў Савецкім Саюзе.

Мы выйшлі з дакладу і папляліся ў баракі. Мы працавалі йзноў. З намі працавала брыгада калгасьнікаў, але дaступіцца да іх было проста немагчыма. Нас не дапускалі. Але я бачыў, што і яны хацелі перакінуцца словамі з намі.

— Чаму вы так паволі працуеце? — спытаўся я аднойчы аднаго з калгасьнікаў.

— І ты так будзеш працаваць. У вас яшчэ сала. А мы ўжо калі сала ня бачылі.

Каб, як кажуць, пусьціць пыл у вочы, «таварышчы» вызначылі прэмію ў 50 рублёў Івану М...., каб другія, значыцца, лепш працавалі. А гэты Іван гультай з гультаёў. Але, як бальшавікі прыйшлі, дык «буржуяў забіў».

Праца была цяжкая, асабліва для мяне, бо я-ж, уласьціва, быў хворы. Мне заставалася толькі сапраўды захварэць. Захварэць, аднак, ня было гэтак лёгка. Памог мне ў гэтым добры хірург Г... Аб ім я ніколі не забудуся.

У шпіталі было холадна. 8 градусаў цяплыні. Пры марозах у Расеі гэта для хворых было аж занадта. Але цяплей і быць не магло. Каб ацяпляць гошпіталь, рэзалі прыгожыя акацыі й хвоі з калісь раскошнага парку Так я ляжаў і абдумваў, як-бы трапіць да брата.

Аднойчы прыкацілі з Горіспалкома дзьве шыкарна апранутыя дамы.

—Вы на что жалуетесь? — пыталіся яны кожнага.

— А што давалі есьці?

— Аўсянка, — ціха сказаў я. (А ў той аўсянцы палова мышынай аўсянкі).

Знайшліся, аднак, бывалыя людзі, якія гэтым савецкім арыстакраткам насыпалі праўды ў вочы.

— Гэта-ж яшчэ горш, як у царскай Расеі, — падумаў я.

Дні былі нявымоўна даўгія й цяжкія. Я чакаў брата, якому выслаў тэлеграму. Аднойчы вечарам увайшоў у наш пакой дарослы чалавек у каўнерыку й старым перадваенным паліце.

—Міхась! Што з табой? — спалохана сказаў я, паказваючы брату на каўнерык.

— Гэта яшчэ з Варшавы засталося, перадваеннае.

— А чаму ў гальштуку?

— Раней ганялі, а цяпер не.

Дваццаць адзін год мы ня бачыліся. Гутарка абарвалася. Мы доўга глядзелі адзін на аднаго, а пасьля брат кінуўся да мяне й мы, дарослыя людзі, расплакаліся, як дзеці.

— Раскажу, усё раскажу, — шаптаў брат.

(Далей будзе).

Голад у Бэнгалі

Голад у індускай правінцыі Бэнгалі прыняў такія формы, што прэм'ер міністар Бэнгалі выдаў адозву з просьбай аб дапамозе да мясцовага насельніцтва.

Галадаючыя жыхары Бэнгалі плывуць у Калькуту, спадзяючыся знайсьці там выжыўленьне. Паводле апошніх дадзеных на вуліцах Калькуты знаходзілася каля 80 000 галадаючых. Выпадкі галоднай сьмерці павялічваюцца з кожным днём. Урад стараецца дапамагчы ў спэцыяльна зарганізаваных для гэтай мэты лягерах, але лічба галадаючых гэтак вялікая, што ані лягеры, ані гошпіталі ня могуць палепшыць гэтага жудаснага палажэньня.

З ...давецкае нівы

...ШЧАГЛСЎ. Зборнік купальскіх ...нь і жніўных песьняў.

...ік купальскіх і жніўных песьняў сп. М. ...ова можна лічыць прыдатным да карыс... ў пачаткавай беларускай школе. Ён буд... ...аній помаччу настаўніку ў навучэньні ... беларускім сьпевам.

... усіх песьняў чысты, ён будзе клікаць ...адчуваньня хараства народнай песьні, чым ...гаціць дзіцячую душу.

...борніку ёсьць 30 песьняў. Амаль палавіна з іх згарманізована на мажорны лад.


Ёсьць часьціна песьняў у зборніку, у якіх ня выяўлена выразна тая гама, у якой яна згарманізавана. Да тых песьняў слабей прыгатаванаму настаўніку трудна будзе прыступіцца. Але такі настаўнік патрапіць у гэтым ...ыпадку парадзіцца з сваім суседам па шк... ...які лепш разьбіраецца.

...ы зборнік добра: папера моцная, др... ...ае ...і памылак у тэксьце і ў матыва... ...ся выдаць.

Настаўнік Ів. ЕВЕЦ

У І...дыі выпусьцілі ...рыштаваных

Падод... ...авадачаў з Ноага-Дэлі, у вапошнім ...з ў Індыі павялічыліся дэманстрацы... ...іх індусы дамагаліся выпушчэньня з ту... ...штаваных сяброў кангрэсу. Дзеля гэта... ...ад заходня-паўночнай правінцыі быў змуш... выпусьціць 150 г. зв. чырвонакашульнікаў, якія прыймалі ўдзел у разрухах у часе кангрэсу. Далейшыя 1 000 чырвонакашульнікаў, якія яшчэ знаходзяцца ў турме, маюць быць таксама зволнены ў хуткім часе.



Дунайскі параплаў на Дняпры.

Шматлікія затопленыя бальшавікам на Дняпры караблі йзноў выдабыты нямецкім войскам і ўведзены ў строй. Акрамя таго для перавозу тавараў уведзены дунайскія параплавы. На здымку: заладаваньне кансэрваў на параплаў.

Herausgeber und Druck Sturmverlag G.m.b.H Zweigniederlassung Bialystok Langgasse 16. Tel. 1020 1021

шыся ад Богушавых і выклікаўшы з крамы Юзіка (трэцяга члена бюро ячэйкі), яны пра нешта доўга спрачаліся. Пра што была гутарка, праз перагародку добра не ўразумець, але Янук усё крычаў на Скуратка: «Што ты з імі цацкаешся? Дырэктывы партыі. Правая палітыка... Ліквідаваць, як «клясу». — Якая гэтая правая палітыка, ня ведаю. Памойму, дык зусім няправая... — закончыў Зенька.

— Тваёй абароне аддаемся, сьвятая Божая Маці, — шаптала Богушыха.

— І гэтак, штовечар: гавораць, гавораць, — кажа Зенька. — І як языкі не забаляць?

— Пра адно буду прасіць цябе, Зенька, — сказаў, урэшце, Богуш. — Калі што якое здарыцца з намі, дык паведамі Раінку. Нас зжывуць, дык няхай хоць дзяцей выратуе.

— Людзі самі на сябе аброць надзелі, — разважае Зенька. — Гэта, як я ўспомню, у сямнаццатым годзе. Жылі людзі, гора ня ведалі, раптам усхадзіліся...

Зенька пайшоў, а тое, што ён сказаў, яшчэ доўга турбавала Богушавых.

— Я так і ведаў, што ўсё гэта Янук капае, — заўважыў Богуш.

— Схадзіў-бы ты да Сукеса, усё-ткі ён начальнік тутака, у раёне, большы, ды мо' яшчэ і не забыўся, як і мы колісь яго ня чураліся, — параіла Богушыха.

— Так ісьці няма чаго. Трэба ўсё гэта выкласьці ў заяве, тады хутчэй разьбяруць.

Наважылі заўтра ўраньні ісьці да Мікітавага сына, вучня сямігодкі, прасіць, каб ён склаў заяву, і тады ўжо зьбегаць у раён. «Да дванаццатай гадзіны яшчэ можна пасьпець добра падцерці нос гэтаму зладзюгу Януку», сказаў Богуш. Разважыўшы гэтак, яны нават крыху павесялелі. Але тое, што здарылася заўтра ўраньні, зноў зьбянтэжыла іх. На засьценку разьнясьліся чуткі, што на вуліцы ляжыць няжывы Хвёдарка Скураток. Да Богушавых першай прыбегла з гэтай навінаю Марыля Бабок.

— А вы сьпіцё і нічога ня ведаеце, — гэта-ж Скуратох няжывы каля вашага плоту.

Прыйшоў Богуш. Праўда, ляжыць Скураток у гразі, рукі раскінуў, нагой упёрся ў груду зямлі (у тую ноч быў мароз), ляжыць і ў кулаку сухі камячок зямлі раскрышыў. (Сьмерць такі і напаткала яго каля плоту). Людзі абкружылі, глядзяць.

На Скуратку ня было нічога такога, што паказала-б на забойства. Але прыехаў прадстаўнік ГПУ з міліцыянэрамі і вышуковым сабакам. «Зэфір» абнюхаў хведаркаву сьвітку, лізнуў ягоны пасінелы твар, якраз каля самага роту, з якога мо' яшчэ несла перагарам, брахнуў разы двы ды, абегшыся крокаў на колькі, падняў нагу на плот.

— Расьпісаўся, — нехта заўважыў з натоўпу. На вуліцы пакаціўся сьмех.

Прыехаў на ўласнай машыне і сакратар райкому Сукес Сроль. А неўзабаве — і пракурор Агон Ісакавіч, як называў яго Сукес. Прывезьлі з сабой і спэцкора цэнтральнай газэты (мабыць, у раёне быў выпадкова). Спачатку яны цікавіліся толькі справай Скуратка. Але, не знайшоўшы забойцы, пачалі «выкрываць злосных»: хто ня выканаў збожжанарыхтовак, хто ня ехаў рабіць на шашу і хто ня ішоў у калгас. А назаўтра ў газэце зьявілася нататка, у якой паведамлялася пра «забойства Хвёдаркі, у мінулым пастуха, чалавека, прасякнутага ідэяй камунізму».

— Калі ён быў чым-небудзь прасякнуты, — сказаў дырэктар нашае сямігодкі,— дык гэта толькі гарэлкай.

Нататка канчалася: «Мы ведаем, хто зрабіў гэтую справу. Мы ведем і натхніцеляў гэтага забойства, тых, хто сунуў нож у рукі забойцы. Сьмерць кулакам і іхным ідэолёгам — беларускім нацдэмам!».

— ... і нож ужо зьявіўся.

— ... хіба Скураток быў забіты? — пыталіся ... у аднаго.

— ...у, цяпер, браце, трымай хвост вышэй...

...падумаў: «Дзякуй Богу. Зоймуцца гэта... ...авай, дык мо' і пра мяне забудуцца».

...і ўпамінаньне пра «нацдэмаў» яго вель... непакоіла. Шмат знаёмых дачкі Раіны ..., як нацдэмаў. Дый яна сама пісала кал... вершыкі. «Патрэбны ёй гэтыя цацкі? — ... стары. — Ці яны накормяць? Дзе ейн... гэтыя вершыкі?»

...палез у сундучок, дзе яшчэ хаваліся ...ацкія сшыткі Раіны. Пажоўклыя ба... ...еры, перакладзеныя сухімі лісточкамі ... кветкамі бэзу, дзьмухаўцамі, якія Раіне ...алі-б не адну вясну, дрыжалі ў нязгра... руках усхваляванага бацькі.

...ны толькі прыкрасьці ад гэтых вершы... ...я той цяпер час, каб песьні пяяць...

...рожна згарнуў сшытак і недзе схава... ...й ад вачэй людзкіх.

У той дзень заарыштавалі дырэктара школы, які дазволіў сабе выраз наконт прасякненьня «ідэямі». Але Богуша, як ён і меркаваў, не кранулі: прайшло і дванаццаць і дзве гадзіны, — ніхто да іх нават не зьявіўся. Яны ўжо і зусім павесялелі: «От, дзякаваць Богу. Бяз зла ня бывае дабра». Раптам прыйшла ад Зенькі дзяўчынка:

— Дзядзенька, тата казаў, каб вы ведалі...

Богуш і жонка кінуліся тое-сёе хаваць, але было позна: за вакном паказаліся Янук, Юзік і сам Сукес Сроль.

— Ну, усё, — сказаў Богуш і апусьціўся, нібы зламаны надвая, у крэсла. — Ідуць завязаць...

Гэтак, бывала, маці Сукеса, тоўстая такая жыдоўка, палохала сялянаў: «Вы ўсе ў нас у мяшку, — застаецца толькі завязаць». От стары і прыгадаў. Раптам Богуш кінуў позірк пад лаву, дзе ляжала навостраная сякера, з якой ён езьдзіў у лес. «Я вас, сволачы!» Багушыха да яго:

— Ня губі дзяцей! Ня губі дзяцей, — і засланіла сабою сякеру.

Богуш зноў апусьціўся ў крэсла, як і ўчора, хапіўшыся за грудзі. Калі ў хату ўвайшлі Сукес, Янук і Юзік, старая сказала:

— Дзяжу з цестам на печ ставілі, засопся...

Сукес, дык той хоць запытаўся, як стары знаёмы: «Ну, як жывеш, Богуш?» А Янук і Юзік, дык нават не прывіталіся.

— Якая справа вас прынесла да нас? — сказаў, задыхаючыся, Богуш.

— Усялякія справы бываюць, — адказаў Сукес, — і прыемныя і няпрыемныя. Такое ўжо нашае жыцьцё. От, жывем як-небудзь: дзень тут, дзень там... Цяпер у нас справа няпрыемная...

Ён расшпіліў свой шыкоўны жоўты партфэль, застругаў алавік, паклаў на стол нейкую паперу. І ўсё гэта ён рабіў так марудна, павольна, што Богуш сядзеў, як на вугальлі. А Сукес, убачыўшы на шасьце вянок цыбулі, давай пра цыбулю: «Якая цыбуля. І дзе яна такая расла? А мая Рыўка ня купіць ніяк цыбулі». Але, урэшце, Сукес пачаў чытаць тую паперу, водзячы алоўкам па радкох. У ёй і быў лёс Богушавых. Цэлая гурба розных злачынстваў, пр... якія Богуш, каб не пачуў ад Сукеса, так і ня ведаў-бы аж да самай сьмерці: «Ігнараваньне законаў савецкай улады. Зл...ае ўхіленьне ад выкананьня абавязку перад дзяржавай. Агітацыя супроць рабоча-сялянскай улады». Пасьля, спаслаўшыся на рэзалюцыі пленумаў, зьездаў, заключыў:

— Пазбаўляецца ўсяе маёмасьці... Высылаецца з межаў раёну ў вадаленыя мясьціны...

(Далей будзе).